View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# ЗНАЧЭННЕ ВЫВУЧЭННЯ ВЫТОКАЎ УЛАСНАЙ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ СТУДЭНТАЎ ЭСТЭТЫЧНАГА ПРОФІЛЮ

А. М. Кукрэш, Мінск, Беларусь

Эстэтычна адукаваны чалавек павінен ганарыцца сваёй Радзімай, ведаць культуру свайго народа, свае песні, танцы, паданні, традыцыі і ўсё тое, што завецца традыцыйнай культурай.

У наш час усё менш застаецца людзей, якія могуць расказаць пра гісторыю сваіх мясцін, заспяваць песні сваіх бабуль і матуль. Яшчэ некалькі год – і падаваць як «старадаўнія песні» будуць песні сярэдзіны XX ст.: творчасць Алы Пугачовай і Юрыя Антонава ды іншых (на фальклорнай прктыцы пяць год таму ўжо былі спробы «маладых» бабуль заспяваць «Всё могут короли», «Арлекино» і гэтак далей), а наконт «жніўных», «вясельных» – тым больш, – ці будуць апытаныя ведаць што маецца наўвазе?). Таму можна пазайздросціць тым студэнтам, якія мелі магчымасць наведваць вёскі і на працягу фальклорных экспедыцый навучыліся збіраць, запісваць, расшыфроўваць, класіфікаваць фальклор. «…Тэрмін “фальклор”, які ў перакладзе абазначае народную мудрасць, народныя веды, ужываецца ў міжнароднай навуцы, і ўсё часцей ва ўсходнеславянскай, не толькі ў вузкім значэнні – вусна-паэтычная творчасць, але і ў набліжаным да яго першапачатковага зместу і ахоплівае розныя праявы народнай культуры, у тым ліку музычнае, харэаграфічнае, дэкаратыўна-прыкладное і іншыя віды народнага мастацтва, да якога ён у кожным канкрэтным выпадку адносіцца» [1, с. 5]. Тым больш, што «… з многіх і многіх складзеных калі-небудзь твораў народ выбірае і захоўвае, шліфуючы дзесяцігоддзямі толькі самае лепшае, сугучнае яго думкам і эстэтычным поглядам» [1, с. 7]. Вывучэнне вытокаў уласнай традыцыйнай культуры мае вялікае значэнне яшчэ і таму, што ў праграмах агульнаадукацыйных школ ёсць вывучэнне народных песень і святаў, у музычных школах слухаюць і выконваюць творы, якія будуюцца на народных песнях. Харэографы з задавальненнем вывучаюць беларускія танцы. І наогул, адукаваны чалавек праз веданне сваіх культурных традыцый больш зразумее традыцыі і душу іншых народаў свету. Чалавека трэба з дзяцінства прывучыць адчуваць свае карані, меладычную лінію роднай песні, яе гарманічныя і рытмічныя асаблівасці. «Знаёмства з народнай песняй пачынаецца з першага яе праслухоўвання вучнямі, якое пакідае ў іх агульнае ўражанне, а пры паўторных праслухоўваннях яно ўзмацняецца, удакладняецца. Спачатку твор успрымаецца дзецьмі як цэлае, без вылучэння асобных спецыфічных якасцей, якія з’яўляюцца паступова ў выніку практычнай дзейнасці» [2, с. 364]. І ўсё гэта павінен ведаць і адчуваць выкладчык, каб дапамагчы вучням зразумець творчасць свайго народа: «Народная творчасць наогул характарызуецца сінкрэтычнасцю. Сінкрэтызм як непарыўнае спалучэнне розных відаў мастацтва ў адным творы дазваляе ўсебакова выкарыстоўваць народныя песні ў працэсе навучання, развіцця і выхавання падлеткаў» [3, с. 5].

Менавіта комплекснае вывучэнне такіх дысцыплин, як сальфеджыа, музычная літаратура, гармонія, народная творчасць, фальклор, спевы, музычныя інструменты і іншыя, даюць магчымасць глыбей спасцігнуць кожную дысцыпліну паасобку і больш дасканала. А ў выкарыстанні ведаў вялікую ролю павінны выконваць практыкі: школьная, музейная, фальклорна-этнаграфічная, у фальклорных і танцавальных калектывах. Студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыкаў і з іх непасрэднай дапамогай набываюць магчымасць пагружэння ў будучую прафесію. Звычайна на практыцы студэнт сутыкаецца з тымі прабеламі ў сваёй адукацыі, якія немагчыма высветліць на звычайных лекцыях і семінарах, і мае спробу іх вырашэння. А. М. Аляхновіч прапануе будучым настаўнікам музыкі аспекты метадычнага плану, распрацаваныя для вывучэння народнай песні ў школе, якія можна выка-

РЕПОЗИТОРИЙ

рыстоўваць і кіраўнікам народных калектываў, і настаўнікам музычных школ і школ мастацтваў [4, с. 14].

Індывідуальны творчы падыход дае магчымасць цёплага плённага кантакту паміж вучнем і настаўнікам, выклікае цікаўнасць да прадмета, дае магчымасць задумацца над сапраўднымі каштоўнасцямі, дапамагае звярнуць увагу не на знешнія праявы асобы, а на ўнутраны свет чалавека, што знаходзіцца побач. У наш час, калі дзеці большасць часу, нягледзячы на забароны бацькоў, праседжваюць за камп'ютарам, займаючыся гульнямі ў стрэльбы і віртуальным «сяброўствам» праз сацыяльныя сеткі, больш за ўсё нясе страты духоўнае развіццё. Сучасныя дзеці не маюць звычкі эмацыйна спачуваць і рэагаваць на пакуты і перажыванні іншых людзей. І гэтаму трэба вучыць з дзяцінства: «Выкарыстанне музычнага фальклору ў школе – гэта далучэнне вучняў да гісторыі і культуры свайго народа.» [4, с. 17]. Сумесная падрыхтоўка да традыцыйных святаў, якая пачынаецца с размовы пра будучае дзеянне, са збору інфармацыі, напісання сцэнарыя і г. д., – усё гэта аб'ядноўвае сям'ю, дае дзіцяці магчымасць адчуць сябе беларусам, зразумець прыналежнасць да культуры свайго народа. Гэта і адчуваюць студэнты, якія трапляюць на фальклорна-этнаграфічную практыку. Яны пагружаюцца цалкам у вясковае жыццё, спрабуюць гаварыць на мове апытваемых жыхароў, выкарыстоўваюць мясцовае вымаўленне, вучацца падтрымліваць гаворку, уважліва слухаць, будаваць кірунак гутаркі. Падчас размовы бываюць розныя непрадказальныя моманты, і трэба мець творчы падыход, каб дастойна знайсці выйсце і працягваць дыялог. Такія сустрэчы надаюць вялікі выхаваўчы, педагагічны, эстэтычны, агульнаадукацыйны, прафесійны, гістарычны, арганізацыйны вопыт. Вядомы беларускі першадрукар, асветнік і гуманіст Францыск Скарына пісаў, што ўсе жывыя істоты: і звяры, і птушкі, і рыбы, і пчолы ведаюць свае пенаты, «… тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по Бозе, к тому месту великую ласку имають» [5, с. 3].

Можна зрабіць выснову, што «…для якаснага і дакладнага ўзнаўлення народнай песні ў школе настаўнік музыкі павінен самастойна спасцігаць разнастайныя агульнатэарэтычныя, метадычныя і практычныя пытанні, звязаныя з выкарыстаннем народнай песні ў рабоце з вучнямі» [4, с. 13]. Паспяховасць у будучай прафесіі залежыць ад творчай рэалізацыі будучага выкладчыка, а праз гэта адбываецца развіццё творчай індывідуальнасці кожнага вучня паасобку.

- Літаратура

1. Беларускі фальклор: Хрэстаматыя: Вучэб. дапам. для філ. фак. ВНУ / склад. К. П. Кабашнікаў [і інш.]. – 4-е выд., перапрац. – Мінск : Выш. шк., 1996. – С. 856.

2. Аляхновіч, А. М. Беларуская традыцыйная музычная спадчына : дапам. для наст. / А. М. Аляхновіч. – Мінск : «Беларусь», 2000. – С. 382.: нот. іл.

3. Кавалёў, А. І. Народная музычная творчасць (беларускія народныя песні) : вучэб. дапам. / А. І. Кавалёў, В. М. Яшчанка. – Мінск : БДПУ, 2010. – С. 243.

4. Аляхновіч, А. М. Народная песня ў школе : дапам. для наст. музыкі і спеваў, кл. кіраўнікоў, выхавальнікаў / А. М. Аляхновіч. – Мінск : «Беларусь», 2004. – С. 171.: нот. іл.

5. Касцюкавец, Л. П. Беларускія народныя абрады / склад., навук. рэд. і прадм. Л. П. Касцюкавец. – Мінск : Беларусь, 1994. – С. 128.

РЕПОЗИТОРИЙ